Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________С.Л. Шпарло
“07” 07 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6206/эвуч.

# ТЭОРЫЯ ІНФАРМАЦЫІ І КАМУНІКАЦЫІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, зацверджанага Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 18.01.2023 № 6-05-03-007/пр., вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.Ю. Вайцэховіч, загадчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Л.А. Аўгуль, загадчык навукова-даследчага аддзела дзяржаўнай установы “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”;

Ж.Л. Раманава, загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 11 ад 26.06.2023);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 7 ад 05.07.2023)

**УЗГОДНЕНА**

Загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства
дзяржаўнай установы “Цэнтральная навуковая
бібліятэка імя Якуба Коласа
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

_________________Ю.А. Пераверзева

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Тэорыя інфармацыі і дакументалогія" складаецца з двух вучэбных дысцыплін "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" і "Дакументалогія". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі".

"Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" – вучэбная дысцыпліна, якая накіравана на азнаямленне з асноўнымі тэорыямі, падыходамі і ключавымі паняццямі ў сферы інфармацыі і камунікацыі з асаблівым акцэнтам на сацыяльна-культурныя аспекты інфармацыйных працэсаў і з'яў.

Мэта вучэбнай дысцыпліны – засваенне студэнтамі тэарэтычных асноў інфармацыі і камунікацыі на ўзроўні, які дазволіць разумець сутнасць і эвалюцыю інфармацыйна-камунікацыйных працэсаў, механізмаў функцыянавання і ацэнкі інфармацыі, абгрунтавана выбіраць мадэлі сацыяльных камунікацый, выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці і ацэньваць іх эфектыўнасць.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач:

– раскрыць катэгарыяльны апарат тэорыі інфармацыі і камунікацыі, сфарміраваць міждысцыплінарны падыход да вывучэння інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з'яў;

– навучыць вызначэнню і аналізу механізмаў функцыяніравання інфармацыі ў прыродзе і грамадстве, яе ўласцівасцей, відаў, спосабаў вымярэння і ацэнкі якасці, асаблівасцей яе фарміравання і выкарыстання ў інфармацыйна-дакументнай сферы;

– забяспечыць разуменне эвалюцыі сацыяльных камунікацый пад уплывам біялагічных, тэхнічных, культуралагічных фактараў, вывучэнне розных тыпаў, відаў і форм камунікатыўнай дзейнасці, мадэляў і каналаў камунікацыі, аперыраванне атрыманымі ведамі пры аналізе і прагназаванні камунікатыўных працэсаў у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Вучэбная дысцыпліна "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" скіравана на вывучэнне міждысцыплінарных феноменаў інфармацыі і камунікацыі, што магчыма толькі пры фарміраванні цэласнага ўяўлення аб фізічных, біялагічных, сацыяльных, культуралагічных асновах інфармацыйных і камунікатыўных працэсаў і з'яў. Гэта абумоўлівае павышаную складанасць дысцыпліны і патрабуе трывалых сувязей з вучэбнымі дысцыплінамі: "Дакументалогія", "Гісторыя кнігі і кніжная культура", "Бібліяграфазнаўства. Тэорыя", "Інфармацыйная культура асобы" і інш. Вучэбная дысцыпліна "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" забяспечвае міждысцыплінарную інтэграцыю агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў і фарміраванне на гэтай аснове цэласнага інфармацыйнага светапогляду.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" накіравана на фарміраванне наступных кампетэнцый:

УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

БПК-4. Вызначаць відавы склад і структуру дакументаў, прымяняць міждысцыплінарныя падыходы да аналізу інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў, выкарыстоўваць спосабы арганізацыі бібліятэчнай камунікацыі на аснове ведаў аб відах, мадэлях, каналах сацыяльнай камунікацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

*ведаць:*

– законы, уласцівасці і функцыі інфармацыі і камунікацыі, механізмы ўзнікнення і функцыянавання інфармацыі ў нежывой, жывой прыродзе і грамадстве;

– сутнасць і разнавіднасці інфармацыйных і камунікатыўных працэсаў у грамадстве;

– эвалюцыю сацыяльнай камунікацыі, формы і віды камунікацыйнай дзейнасці.

*умець:*

– праводзіць сістэмны і параўнальны аналіз розных канцэпцый разумення інфармацыі і камунікацыі;

– вызначаць характэрныя рысы камунікацый у сістэме класічнага, некласічнага і постнекласічнага тыпу рацыянальнасці, спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў сістэме сучасных сацыяльных камунікацый.

*валодаць:*

– рэсурсным падыходам да інфармацыі;

– падыходамі да вызначэння эфектыўнасці сацыяльных камунікацый, вызначэння праблем і шляхоў іх пераадолення;

– спосабамі арганізацыі прафесійнай камунікацыі на аснове ведаў аб відах, мадэлях, каналах сацыяльнай камунікацыі.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" рэкамендуецца выкарыстоўваць педагагічныя тэхналогіі для актывізацыі мысленчай дзейнасці студэнтаў (праблемнае навучанне, гульнёвыя тэхналогіі), для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу (індывідуалізацыя навучання, тэхналогія паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў), тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці, калектыўныя і групавыя спосабы навучання і інш.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі" прадугледжана – 126 гадзін, з іх 72 гадзіны – аўдыторныя. Прыкладанае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцый – 60 гадзіны, семінарскія – 12 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы вучэбнай дысцыпліны “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі”, яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, формы кантролю. Вучэбна-метадычная забяспечанасць вучэбнай дысцыпліны.

## Раздзел І. Тэорыя інфармацыі

### *Тэма 1. Інфармацыя як навуковая катэгорыя*

Узнікненне паняцця “інфармацыя” і яго развіццё на дакібернетычным, кібернетычным і посткібернетычным этапе. Інфармацыя ў імавернасна-статыстычных і логіка-семантычных тэорыях. Фундаментальныя даследаванні К. Шэнана, Н. Вінэра, А.М. Калмагорава, У. Эшбі і інш. Элементарная схема перадачы інфармацыі. Узаемасувязь інфармацыі з матэрыяй і энергіяй. Інфармацыя ў працэсах кіравання і самакіравання. Кібернетыка і праблемы штучнага інтэлекту. Гуманітарныя даследаванні інфармацыі. Фарміраванне і развіццё атрыбутыўнай, функцыяналістычнай і камунікатыўнай канцэпцый разумення інфармацыі.

Інфармацыя як міждысцыплінарная катэгорыя. Матэматычнае, кібернетычнае, прыродазнаўчае, філасофскае, сацыялагічнае вызначэнне паняцця інфармацыі. Спецыфіка разумення інфармацыі ў кнігазнаўстве, дакументалогіі, бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве.

Інфармацыя ў межах фізічных і біялагічных узаемадзеянняў. Інфармацыя як фактар развіцця чалавека і грамадства. Элементарная, біялагічная, тэхніка-кібернетычная і сацыяльная інфармацыя. Узаемасувязь і спецыфіка тэрмінаў “звесткі”, “дадзеныя”, “інфармацыя”, “веды”.

### *Тэма 2. Асновы функцыяніравання інфармацыі ў грамадстве*

Закон незнішчэння інфармацыі і яго сутнасць. Закон паскарэння і павелічэння аб’ёму інфармацыі. Атрыбутыўныя і прагматычныя ўласцівасці інфармацыі. Знешнія і унутраныя функцыі інфармацыі.

Сімвалізацыя інфармацыі. Паняцце знака і знакавай сістэмы. Знакавы характар інфармацыйных працэсаў у грамадстве. Наасфера і нааінфармацыя.

Меры інфармацыі. Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях. Якасці інфармацыі (змястоўнасць і абароненасць). Змястоўнасць: значнасць – паўната, ідэнтычнасць, кумулятыўнасць – выбіральнасць, гомамарфізм, абароненасць: захаванасць, дакладнасць, канфідэнцыяльнасць.

Класіфікацыя інфармацыі па адносінах да аб’екта, матэрыяльнаму носьбіту, зместу і каштоўнасці, грамадскаму прызначэнню, якасці

праяўлення, характару генерыравання, ступені стабільнасці, форме прадстаўлення і інш. прыметах.

### *Тэма 3. Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення*

Паняцце сацыяльнай інфармацыі, яе сутнасць і асноўныя ўласцівасці. Механізм арэчаўлення сацыяльнай інфармацыі. Матэрыяльная прырода зместу інфармацыі. Сродкі стварэння зместу. Знак, мова, код. Тыпы моў па прасторавай падачы інфармацыі. Матэрыяльная аснова інфармацыі. Фізічная форма. Носьбіты сацыяльнай інфармацыі. Дакументная інфармацыя і яе носьбіты. Акустычная (маўленчая) інфармацыя і яе носьбіты. Тэлекамунікацыйная інфармацыя і яе носьбіты.

Дакументаванне як асноўны спосаб фіксавання сацыяльнай інфармацыі. Спецыфіка і асноўныя ўласцівасці дакумента як формы арэчаўлення інфармацыі.

Інфармацыйныя працэсы ў сацыядакументальнай сферы. Стварэнне, кадзіраванне, пошук, збор, апрацоўка, захоўванне, перадача, распаўсюджанне, выкарыстанне, абарона інфармацыі. Інфармацыйныя патрэбы як перадумова інфармацыйнай дзейнасці.

### *Тэма 4. Інфармацыйныя рэсурсы. Роля інфармацыі ў развіцці сучаснага грамадства*

Паняцце інфармацыйных рэсурсаў, падыходы да яго вызначэння.

Суаносіны паняццяў “інфармацыйныя рэсурсы”, «электронныя інфармацыйныя рэсурсы», «бібліятэчна-бібліяграфічныя рэсурсы».

Інфармацыйны рэсурс як форма прадстаўлення ведаў. Спецыфіка інфармацыйных рэсурсаў у параўнанні з матэрыяльнымі і энергетычнымі рэсурсамі. Уласцівасці, функцыі і прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Відавая класіфікацыя інфармацыйных рэсурсаў.

Інфармацыйнае грамадства, яго прыметы і механізмы станаўлення. Інфармацыйныя тэхналогіі як каталізатар працэса развіцця сучаснага грамадства. Інфармацыйныя прадукты і паслугі. Тэндэнцыі развіцця глабальнай інфармацыйнай прасторы. Канцэпцыя грамадства ведаў. Дзейнасць бібліятэк па арганізацыі і кіраванню сацыяльнай інфармацыяй. Мадэлі развіцця бібліятэк ў кантэксце інфарматызацыі грамадства і фарміравання дапоўненай рэальнасці.

### *Тэма 5. Інфармацыйная бяспека, этыка і права*

Інфармацыя як аб'ект абароны. Паняцце інфармацыйнай і кібербяспекі. Мадэль пагроз бяспецы інфармацыі. Меры забеспячэння аховы інфармацыі. Інструменты кібербяспекі і іх класіфікацыя.

Асновы арганізацыі асабістага інфармацыйнага асяроддзя ў інтэрнет. Этычная і прававая бяспека дзейнасці ў сетцы. Паняцце ананімнасці ў сетцы. Віды кіберпагроз і спосабы павышэння бяспекі дзейнасці ў сетцы.

Ацэнка дакладнасці сеткавай і медыйнай інфармацыі. Спосабы кантролю семантычнай якасці інфармацыі. Арганізаваная дэзінфармацыя і яе віды. Інфармацыйныя войны і асноўныя тэхналогіі іх вядзення. Фейкі і спосабы іх выяўлення. Асаблівасці ацэнкі інфармацыі, якая распаўсюджваецца ў комплексе маркетынгавых камунікацый. Сістэмы ацэнкі дакладнасці навуковай інфармацыі.

## Раздзел II. Тэорыя камунікацыі

### *Тэма 6. Генезіс і развіццё паняцця "камунікацыя"*

Праблемы камунікацыі ў антычнай і сярэдневяковай навуцы, нямецкай філасофіі, герменэўтыцы і семіётыцы. Распрацоўка тэорыі камунікацыі ў межах найбольш значных філасофскіх накірункаў XX ст.: біхевіярызм, экзістэнцыялізм, персаналізм, аналітычная і лінгвістычная філасофія, сімвалічны інтэракцыянізм.

Сучасныя падыходы да разумення паняцця "камунікацыя". Суадносіны паняццяў "камунікацыя", "сацыяльная камунікацыя", "зносіны".

Сутнасць трансляцыйнай і інтэракцыянальнай парадыгмы. Трансляцыйныя падыходы да вывучэння камунікацыі: тэхналагічнага дэтэрмінізма (на прыкладзе тэорыі інфармацыйнага грамадства), культуралагічная тэорыя камунікацыі Г.М. Маклюэна, матэматычная тэорыя камунікацыі. Інтэракцыянальныя падыходы да вывучэння камунікацыі: канцэпцыя этнаметадалогіі, фрэймавая канцэпцыя І. Гофмана, тэорыя міжкультурнага зместу камунікацыі Э. Хола, тэорыі сацыяльнага абмену, структурная лінгвістыка, сучасная семіётыка, тэорыі масавай камунікацыі.

Міждысцыплінарныя сувязі тэорыі камунікацыі.

### *Тэма 7. Сучасныя падыходы да вывучэння камунікацый*

Праблемы біялагічнага разумення эвалюцыі сацыяльных камунікацый. Камунікацыя ў антрапагенезе. Вывучэнне камунікацый у сучаснай эвалюцыйнай біялогіі. Тэхнічны падыход да разумення эвалюцыі сацыяльных камунікацый. Уяўленні аб эвалюцыі камунікацый ў межах культурна-філасофскага падыходу.

Сучасныя канцэпцыі разумення сутнасці сацыяльнай камунікацыі: рытарычная, семіятычная, кібернетычная, сацыяльна-псіхалагічная, дыялагічная, герменеўтычная, постмадэрністычная і інш. Камунікацыя і камунікатыўныя працэсы ў межах класічнага, некласічнага, постнекласічнага тыпу рацыянальнасці. Сэнс, разуменне і інтэрпрэтацыя. Крытыка класічнага разумення камунікацыі ў постмадэрністычных тэорыях. Дэканструкцыя і азначванне. Тэорыя дыскурса і гульнёвых вербальных практык.

Законы і заканамернасці сацыяльнай камунікацыі: закон узрастання камунікатыўных патрэбаў людзей, закон гетэрагеннасці камунікатыўных сістэм, закон зваротнай сувязі, закон мінімальнай асновы і інш.

### *Тэма 8. Камунікатыўная дзейнасць*

Іерархія чалавечых запатрабаванняў як зыходная прычына камунікатыўнай дзейнасці. Асноўныя элементы камунікатыўнага працэса. Камунікатыўныя бар'еры: бар'еры, абумоўленыя фактарамі асяроддзя, тэхнічныя, псіхафізіялагічныя і сацыякультурыня бар'еры.

Камунікатыўныя каналы: натуральныя (вербальныя і невербальныя) і штучныя (дакументны і тэлекамунікацыйны). Асаблівасці дакументнага каналу камунікацыі. Кніга як сродак сацыяльна-культурнай камунікацыі.

Параметры класіфікацыі мадэляў камунікацыі. Лінейныя і нелінейныя мадэлі камунікацыі. Знешнія і ўнутраныя функцыі сацыяльнай камунікацыі.

Паняцце аб эфектыўнасці камунікацыі.

### *Тэма 9. Віды, узроўні і формы сацыяльнай камунікацыі*

Міжасабовая, групавая і масавая камунікацыя і яе асаблівасці. Асоба камунікатара. Мэты камунікатара. Камунікатыўныя ролі. Паняцце "абагульненага камуніканта".

Вербальная камунікацыя. Камунікатыўныя функцыі мовы. Змест, формы і сродкі маўленчай камунікацыі.

Асаблівасці невербальнай камунікацыі і яе эфектыўнасць. Параўнанне верабльнай і невербальнай камунікацыі. Пара- і экстралінгвістычныя асаблівасці невербальнай камунікацыі. Прастора-часавая арганізацыя камунікатыўнага акту.

Падраджанне, кіраванне і дыялог як формы сацыяльнай камунікацыі. Асаблівасці іх праяўлення на міжасабовым, групавым і масавым узроўні.

Камунікацыі ў розных сацыяльных сферах: бытавая, вытворчая, бізнес-камунікацыя, навуковая, адукацыйна-педагагічная, шоу-бізнесу і спартыўнага бізнесу, турыстычнага бізнесу, медыцынская і юрыдычная, міжнародная камунікацыя. Стылі і жанры прафесійна-арыентаванай камунікацыі. Формы міжкультурнай камунікацыі.

### *Тэма 10. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць як сфера сацыяльных камунікацый*

Бібліятэчная і бібліяграфічная камунікацыя, яе сутнасць і метасістэма. Суадносіны паняццяў "бібліятэчная камунікацыя" і "бібліятэчныя зносіны". Асноўная мэта і вынік бібліятэчна-бібліяграфічнай камунікацыі. Патрэбы ў бібліятэчна-бібліяграфічнай камунікацыі. Функцыі і прынцыпы бібліятэчнай камунікацыі. Міжасобасная, групавая і масавая камунікацыя ў органах інфармацыі і бібліятэках.

Бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як арганізаваны ўзровень бібліятэчна-бібліяграфічнай камунікацыі. Спецыфіка бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці як сферы сацыяльнай камунікацыі. Эфектыўнасць бібліятэчна-бібліяграфічнай камунікацыі.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ДЗЕННАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1 | Уводзіны | 1 | | | |
| | **Раздзел І. Тэорыя інфармацыі** | | | | |
| 2 | Тэма 1. Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 5 | 2 | 2 | Праблемныя і даследчыя заданні, тэсты |
| 3 | Тэма 2. Асновы функцыянавання інфармацыі ў грамадстве | 6 | 2 | 2 | Развіццёвыя заданні па аналізу прагматычных уласцівасцей інфармацыі |
| 4 | Тэма 3. Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 4 | 2 | | Абмеркаванні, праблемныя заданні тэсты |
| 5 | Тэма 4. Інфармацыйныя рэсурсы. Роля інфармацыі ў развіцці сучаснага грамадства | 4 | | 2 | Абмеркаванні, праблемныя і даследчыя заданні, тэсты |
| 6 | Тэма 5. Інфармацыйная бяспека, этыка і права | 4 | | | Абмеркаванні, праблемныя заданні |
| | **Раздзел ІІ. Тэорыя камунікацыі** | | | | |
| 7 | Тэма 6. Генезіс і развіццё паняцця "камунікацыя" | 4 | 2 | | Тэсты ў міні-групах |
| 8 | Тэма 7. Сучасныя падыходы да вывучэння камунікацый | 6 | | 2 | Тэсты ў міні-групах, праблемныя заданні, групавыя абмеркаванні, эсэ |
| 9 | Тэма 8. Камунікатыўная дзейнасць | 6 | 2 | 2 | Праблемныя і даследчыя заданні |
| 10 | Тэма 9. Віды, узроўні і формы сацыяльнай камунікацыі | 4 | 2 | 2 | Тэсты, праблемныя і даследчыя заданні, эсэ |
| 11 | Тэма 10. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць як сфера сацыяльных камунікацый | 2 | | | Дыскусіі, праблемныя заданні |
| | **Усяго** | **46** | **12** | **12** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| Уводзіны | 1 | |
| Тэма 1. Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 2 | |
| Тэма 2. Асновы функцыянавання інфармацыі ў грамадстве | 4 | |
| Тэма 3. Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення. Інфармацыйныя рэсурсы | 2 | 2 |
| Тэма 4. Генезіс і развіццё паняцця "камунікацыя". Сучасныя падыходы да вывучэння камунікацый | 3 | |
| Тэма 5. Камунікатыўная дзейнасць | 2 | |
| Тэма 6. Віды, узроўні і формы сацыяльнай камунікацыі. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць як сфера сацыяльных камунікацый | 2 | |
| **Усяго** | **16** | **2** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная літаратура*


1. Вайцехович, Н. Ю. Теория информации и коммуникации : учеб.-метод. комплекс / Н. Ю. Вайцехович ; Министерство культуры Республики Беларусь, Белорусский государственный университет культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2018. – 326 с.
2. Шарков, Ф. И. Коммуникология: основы теории коммуникации [Электронный ресурс]: учеб. / Ф. И. Шарков. – 6-е изд., стер. – Москва : Дашков и К°, 2021. – С. 102-343. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book_red&id=621689.


*Дадатковая літаратура*


3. Арутюнов, В.В. Типология и особенности современных коммуникаций в работе библиотек (Искусство и наука общения) : учеб.–метод. пособие / В.В. Арутюнов. – Москва : Литера, 2009. – 216 с.
4. Гавра, Д.П. Основы теории коммуникации : учеб. пособие / Д.П. Гавра. – Санкт-Петербург : Мир книг, 2011. – 284 с.
5. Информатика как наука об информации: информационный, документальный, технологический, экономический, социальный и организационный аспекты / Р.С. Гиляревский, И.И. Родионов, Г.З. Залаев [и др.]; под ред. Р.С. Гиляревского ; автор-составитель В.А. Цветкова. – Москва : Фан – пресс, 2006. – 592 с. – С. 9–86.
6. Кашкин, В.Б. Введение в теорию коммуникации / В.Б. Кашкин. – Москва : Флинта : Наука, 2013. – 223 с.
7. Колин, К.К. Фундаментальные основы информатики: социальная информатика : учеб. пособие / К.К. Колин. – Москва : Академический проспект : Екатеринбург : Деловая книга, 2000. – 350 с.
8. Котенко, В. В. Теория информации : учебное пособие : / В. В. Котенко. – Ростов-на-Дону ; Таганрог : Южный федеральный университет, 2018. – 240 с. (ЭБС «Университетская библиотека онлайн»)
9. Курлов, А.В. Теория социальной информации : учеб. пособие / А.В. Курлов, В.К. Петров. – Уфа : РИО ВашГУ, 2003. – 114 с.
10. Лявончыкаў, В.Е. Тэарэтычныя праблемы інфармацыйных рэсурсаў / В.Е. Лявончыкаў // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 95 – 100.
11. Лявончыкаў, В.Е. Спецыфіка праяўлення законаў і функцый сацыякультурнай камунікацыі ў дзейнасці бібліятэк / В.Е. Лявончыкаў // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук канф. (Мінск, 13–14 ліст. 2008 г.) . – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – С. 216–220.

12. Романов, А. А. Массовые коммуникации: учебно-практическое пособие : учебное пособие / А. А. Романов. – Москва : Евразийский открытый институт, 2010. – 175 с. (ЭБС «Университетская библиотека онлайн»).
13. Об информации, информатизации и защите информации : Закон Респ. Беларусь от 10 нояб. 2008 г. № № 455–З [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://etalonline.by/document/?regnum=h10800455.
14. Основы теории коммуникации: учебник для высш. учеб. зав. / под. ред. проф. М.А. Василика. – Москва : Гардарики, 2003. – 615 с.
15. Соколов, А. В. Науки об информации и библиотекарь: профессионально-мировоззренческое пособие / А. В. Соколов. – Москва : Литера, 2010. – 144 с.
16. Соколов, А. В. Социальные коммуникации : учебник для бакалавров, обучающихся по направлению подготовки «Библиотечно-информационная деятельность» / А. В. Соколов. – Москва : Профессия, 2014. – 288 с.
17. Cover, Thomas M. Elements of information theory / Thomas M. Cover, Joy A. Thomas. – New York : Wiley-Interscience, 2006. – 748 p.
18. West, R. Introducing Communication Theory: Analysis and Application / Richard West, Lynn Turner. – Boston : McGraw-Hill Humanities, 2009. – 4th ed. – 640 p.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

– праблемныя заданні рознага ўзроўню складанасці па асноўных раздзелах курса і па дысцыпліне цалкам;

– групавыя абмеркаванні найбольш складаных пытанняў курса;

– выступленні на семінарах-даследаваннях, семінарах-дыскусіях;

– выкананне тэстаў, якія ўключаюць як рэпрадуктыўныя, так і творчыя заданні па асноўных раздзелах курса (індывідуальна і ў мінігрупе);

– правядзенне групавых абмеркаванняў вынікаў самастойных работ;

– складанне і запаўненне красвордаў;

– удакладненне і запаўненне табліц па найбольш значных пытаннях курса (асноўныя канцэпцыі разумення сутнасці інфармацыі, эвалюцыя сацыяльных камунікацый, законы і заканамернасці камунікацыі і інш.);

– выкананне даследчых заданняў (крытычны аналіз канцэпцый, разбор эфектыўных і неэфектыўных камунікацый у адукацыйным, медыйным, бібліятэчным асяродку, правядзенне прагнастычных даследаванняў па праблемах будучыні камунікатыўных сродкаў, фармалізацыі бібліятэчных камунікацый і інш.);

– напісанне эсэ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Комплекс заданняў для самастойнай работы студэнтаў забяспечвае паглыбленае вывучэнне такіх тэм, як "Сучасныя падыходы да вызначэння сутнасці феномена інфармацыі", "Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях", "Тыпы і віды камунікатыўнай дзейнасці", "Сацыяльная памяць" і інш. Заданні носяць развіццёвы характар і пабудаваны такім чынам, што студэнт на аснове самастойна вывучаных крыніц павінен вырашыць задачу, якая патрабуе прымянення атрыманых ведаў: ацаніць эфектыўнасць розных мадэляў сацыяльных камунікацый; вызначыць спосабы пераадолення інфармацыйных бар'ераў у пэўных сітуацыях; выправіць і дапоўніць табліцу "Эвалюцыя сацыяльных камунікацый"; прапанаваць схему камунікатыўнага акта для розных камунікатыўных сітуацый і інш.

Выкананне праблемных заданняў магчыма толькі на аснове перапрацоўкі знойдзенай і вывучанай інфармацыі ў асабістыя веды, што з'яўляецца асноўнай умовай якасці навучання. Неабходна таксама заўважыць, што такія заданні адпавядаюць кампетэнтнаснаму падыходу да навучання, бо дазваляюць засвоіць не толькі навукова-прадметныя веды, але і працэдурныя (метады і спосабы дзеяння), у непасрэднай практычнай дзейнасці студэнтаў.

У асобную групу вылучаюцца заданні павышанай складанасці, якія дазваляюць зарабіць дастаткова высокія рэйтынгавыя балы і выконваюцца студэнтамі па жаданні. Для выканання гэтых заданняў, як правіла, неабходна праявіць высокі ўзровень творчага, прадуктыўнага мыслення, глыбока вывучыць досыць вялікі масіў дадатковай літаратуры, а адказы падмацаваць спасылкамі на рэсурсы, якія змяшчаюць дакладную інфармацыю з абгрунтаваннем яе навуковасці і надзейнасці. Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Законы і заканамернасці камунікацыі" неабходна не толькі каротка апісаць дзеянне агульных законаў камунікацыі ў сучасным грамадстве, але і вызначыць, пры якіх умовах будуць парушацца заканамернасці ажыццяўлення камунікацыі "закон зваротнай сувязі", "закон неабходнай асновы", "закон знакавага характару камунікацыі" і інш.

У працэсе навучання студэнты самастойна рыхтуюцца да рубежных тэстаў, якія выконваюцца на занятках індывідуальна і ў міні-групах. Усе тэсты маюць не толькі кантралюючы, але і развіццёвы характар, заснаваны на паэтапным фарміраванні разумовых дзеянняў. Самастойная работа студэнтаў уключае таксама падрыхтоўку электронных прэзентацый, графічных схем і канспектаў па пэўных тэмах, што навучае згортваць інфармацыю, пераводзіць яе з аднаго віду ў іншы, працаваць з інфармацыяй рознага тыпу – тэкставай, графічнай, мультымедыйнай. Для вывучэння тэрмінасістэмы дысцыпліны і фактаграфічнай інфармацыі прадуктыўна складанне і запаўненне красвордаў, якое праводзіцца ў міні-групах.

Адной з найбольш эфектыўных форм самастойнай работы з'яўляецца эсэ, якое выконваецца напрыканцы вывучэння дысцыпліны па адной з дваццаці прапанаваных тэм. Эсэ ўяўляе сабой вольны пераказ уласных думак па праблемнаму пытанню альбо напісанне водгуку на прапанаваны матэрыял (напрыклад, "Паняцце канфармізму і яго значэнне ў сацыяльных камунікацыях. Эксперымент Аша ў студэнцкі групах", "Сацыяльная камунікацыя ў кантэксце актуальных навуковых распрацовак: што робіць чалавечую камунікацыю чалавечай" , "Самыя яркія медыйныя падзеі ...года і іх камунікатыўны аналіз" і інш.). Вялікая ўвага надзяляецца характару вывучаных крыніц, карэктнаму цытаванню, самастойнасці і абгрунтаванасці высноў, творчаму пераасэнсаванню ведаў. Эсэ з'яўляецца абавязковым відам самастойнай работы студэнтаў, і вынік яго выканання ўлічваецца пры фарміраванні выніковага бала па дысцыпліне.

Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў

| Балы | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць прырашчэння кампетэнцый у межах вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, адмаўленне ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў межах вучэбнай дысцыпліны; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны (паняццяў інфармацыі і камунікацыі, знака і знакавых сістэм, інфармацыйных рэсурсаў, метаінфармацыі, камунікатыўнай сістэмы і інш.); наяўнасць у адказе грубых лагічных памылак; некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных задач (вызначэнне віду інфармацыі і формы яе прадстаўлення, ацэнка прагматычных уласцівасцей інфармацыі, распрацоўка элементарнай схемы камунікацыі, першасны аналіз камунікатыўнай сітуацыі, вырашэнне стандартных задач па вымярэнні інфармацыі і інш.), нізкі ўзровень культуры выканання практычных і самастойных заданняў. |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб’ём ведаў па вучэбнай дысцыпліне; веданне некаторых асноўных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (паняццяў інфармацыі і камунікацыі, знака і знакавых сістэм, інфармацыйных рэсурсаў, метаінфармацыі, каналу камунікацыі і інш.), аднак выкладанне адказу з істотнымі памылкамі; грубыя памылкі пры вырашэнні стандартных задач (вызначэнне віду інфармацыі і формы яе прадстаўлення, ацэнка прагматычных уласцівасцей інфармацыі, распрацоўка элементарнай схемы камунікацыі, першасны аналіз камунікатыўнай сітуацыі, вырашэнне стандартных задач па вымярэнні інфармацыі і інш.), нізкі ўзровень культуры выканання практычных і самастойных заданняў. |
| 4 (чатыры) | Дастатковы аб’ём ведаў у межах вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; разуменне законаў інфармацыі і камунікацыі; уменне арыентавацца ў асноўных канцэпцыях разумення сутнасці інфармацыі і камунікацыі, вызначаць від інфармацыйнага рэсурсу па класіфікацыйных прыметах, характарызаваць яго функцыі і ўласцівасці; выкананне стандартных задач з неістотнымі памылкамі; дапушчальны ўзровень культуры выканання практычных заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковы аб’ём ведаў у межах вучэбнай дысцыпліны; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы і даваць ацэнкі; добрае валоданне навуковай тэрміналогіяй |

| | |
|---|---|
| | дысцыпліны; вырашэнне стандартных задач з выкананнем усіх тэхнік і працэдур; разуменне логікі развіцця і сутнасці асноўных канцэпцый інфармацыі і камунікацыі; веданне відаў і форм прадстаўлення інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах; выкананне заданняў па выкарыстанні розных мадэляў і відаў камунікацыі; дастаткова поўнае засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны удзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; уменні аналізаваць інфармацыйныя і камунікатыўныя працэсы і з'явы, рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; добрае валоданне навуковай тэрміналогіяй і інструментарыям дысцыпліны; вырашэнне стандартных задач з выкананнем усіх тэхнік і працэдур; разуменне механізмаў ўзнікнення і функцыянавання інфармацыі ў прыродзе і грамадстве; выкананне заданняў па выкарыстанні розных мадэляў, форм і відаў камунікацыі; выкарыстанне міждысцыплінарнага падыходу да ацэнкі інфармацыйна-камунікацыйных працэсаў і з'яў; уменне выстройваць прафесійную камунікацыю на аснове ведаў аб відах, жанрах і стылях сацыяльнай камунікацыі; поўнае засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; актыўнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных задач; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; уменне праводзіць сістэмны і параўнальны аналіз разнастайных канцэпцый разумення інфармацыі і камунікацыі; разуменне эвалюцыі сацыяльных камунікацый; уменне вызначаць характэрныя рысы камунікацый у сістэме класічнага, некласічнага і постнекласічнага тыпу рацыянальнасці; уменне вызначаць камунікатыўныя патрэбы і спосабы іх задавальнення, ацаніць эфектыўнасць бібліятэчных камунікацый, вызначыць праблемы і шляхі іх пераадолення; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 8 | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах |

| | |
|---|---|
| (восем) | вучэбнай праграмы; актыўнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; высокі узровень самастойнасці і аналітычнага мыслення пры аналізе інфармацыйных працэсаў, камунікатыўнай дзейнасці ў розных сацыяльных сферах; разуменне спецыфікі інфармацыйных працэсаў у сацыядакументальнай сферы і прымяненне атрыманых ведаў для аналізу эфектыўнасці бібліятэчных камунікацый; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; веданне кібернетычных, семіятычных, герменеўтычных, лінгвістычных, псіхолага-сацыялагічных, культуралагічных асноў камунікацыі і спосабаў іх прымянення ў камунікатыўнай дзейнасці; уменне вызначаць спецыфіку розных тыпаў камунікатыўных сістэм і ацэньваць іх эфектыўнасць; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях; высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па пытаннях, якія выходзяць за яе межы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; выразная здольнасць да самастойнага, творчага і эфектыўнага вырашэння задач па аналізу, абагульненню, параўнанню, прагназаванню інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з'яў у грамадстве; веданне кібернетычных, семіятычных, герменеўтычных, лінгвістычных, псіхолага-сацыялагічных, культуралагічных асноў камунікацыі і спосабаў іх прымянення ў камунікатыўнай дзейнасці; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны, выкарыстанне пры адказе і выкананні практычных заданняў дадатковых крыніц, навуковых дасягненняў іншых дысцыплін; сістэматычная, творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны удзел у групавых абмеркаваннях; высокі узровень культуры выканання заданняў. |